УДК 811.163.3

# КАТЭГАРЫЯЛЬНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ АФАРЫСТЫЧНЫХ АДЗІНАК

Іваноў Я. Я. (Установа адукацыі “Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова”, кафедра тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі)

Анатацыя. Вызначаны асноўныя катэгарыяльныя параметры і характарыстыкі афарыстычных адзінак як уласна моўных утварэнняў.

Афарыстычныя адзінкі (афарызмы) – гэта аднафразавыя, пераважна звышслоўныя, намінатыўныя, самастойныя, патэнцыяльна ўзнаўляльныя і ўстойлівыя адзінкі, многім з якіх уласцівы ідыяматычнасць, мастацкасць формы і ўжыванне як асобнага тэксту, але ўсе яны маюць яскрава адметны (універсальны) абагульнены змест, што маніфестуе катэгарыяльную якасць іх плану зместу – афарыстычнасць. Паняцце афарызма суадносіцца з паняццямі ўстойлівых фраз і аднафразавых тэкстаў як дыферэнцыяльнае. Усе ўстойлівыя фразы і аднафразавыя тэксты бываюць або афарыстычнымі (адлюстроўваць рэчаіснасць у абагульнена-ўніверсальным плане), або неафарыстычнымі (адлюстроўваць рэчаіснасць у канкрэтна- ці абагульнена-факталагічным плане).

Афарыстычныя адзінкі належаць да сінтаксічнага ўзроўню, у межах якога ўтвараюць асобную падсістэму і складаюцца з адзінак двух катэгорый – тых, што ствараюцца ў маўленні (афарыстычныя выслоўі як маўленчыя ўтварэнні), і тых, што ў ім паўтараюцца, або ўзнаўляюцца (афарыстычныя клішэ як адзінкі мовы). Падсістэма афарыстычных адзінак проціпастаўлена ў складзе сінтаксічнага ўзроўню мовы ўсім іншым адзінкам гэтага ўзроўню, але не ізалявана ад іх (незамкнёная). Афарыстычныя адзінкі як узроўневыя маюць дзве формы – абстрактную (эмічныя адзінкі, або афарыземы) і канкрэтную (этычныя адзінкі, або афарыстычныя выказванні). Афарызмы, якія ствараюцца ці ўжываюцца як асобныя тэксты, належаць да тэкставага ўзроўню мовы, у межах якога проціпастаўлены іншым (неафарыстычным) аднафразавым тэкстам.

Афарыстычныя і фразеалагічныя адзінкі характарызуюцца розным наборам катэгарыяльных прымет, неаднолькавымі параметрамі выяўлення аднолькавых катэгарыяльных прымет, рознымі семантычнымі, структурнымі, сістэмнымі і функцыянальнымі ўласцівасцямі, утвараюць уласныя мноствы ў межах розных узроўняў моўнай сістэмы, дыферэнцыруюцца на розныя класы і тыпы, уступаюць паміж сабой ва ўзаемныя дэрывацыйныя адносіны, г. зн. з’яўляюцца рознымі катэгорыямі адзінак мовы. Адзінкі толькі аднаго віда ўстойлівых фраз з сінтаксічнай структурай сказа маюць абагульнена-ўніверсальны змест – прыказкі, якія амаль усе з’яўляюцца афарыстычнымі. Тыя крылатыя фразы, парэміі і іншыя клішэ са структурай сказа, якія не маюць абагульнена-ўніверсальнага зместу (не з’яўляюцца афарыстычнымі), адносяцца да фразеалагічных адзінак, што належаць сінтаксічнаму ўзроўню мовы.

Да адзінак мовы адносяцца толькі два агульных класа афарызмаў – парэміялагічныя і крылатыя адзінкі. Парэміялагічныя афарыстычныя адзінкі і тыя крылатыя афарызмы, што не ўжываюцца як індывідуальна-аўтарскія адзінкі, складаюць самастойны агульны клас – афарызмы як адзінкі мовы. Гэты клас дыферэнцыруецца на падкласы на падставе лінгвістычна значных адрозненняў у структуры, асаблівасцей ужывання ў маўленні ў семантычным і фармальным планах. Афарыстычныя адзінкі мовы ўступаюць у парадыгматычныя адносіны, якія дыферэнцыруюцца на семантычныя, формаўтваральныя, афарызмаўтваральныя.

Сукупнасць афарыстычных адзінак мовы ўтварае афарыстычны фонд мовы (або афарыстыкон), які разам з лексічным і фразеалагічным фондамі (лексіконам і фраземіконам) складаюць мноства вышэйшых знакавых адзінак мовы, што прама і непасрэдна суадносяцца з рэчаіснасцю і ў сувязі з яе ўспрыняццем, структурацыяй і канцэптуалізацыяй у масавай свядомасці ўтвараюць моўную карціну свету дадзенага народа (часткай якой з’яўляецца афарыстычная карціна свету – комплекс уяўленняў аб заканамернасцях рэальнага або выдуманага свету).

Афарыстычны фонд агульнанароднай мовы размяжоўваецца паводле экстралінгвістычных і ўнутрымоўных фактараў. Да эстралінгвістычных фактараў адносяцца паходжанне і крыніцы, сацыяльная абумоўленасць функцыянавання, часавая агульнасць афарызмаў, прадметная і канцэптуальная катэгарызацыя свету, адлюстраваная ў іх і г. д. Да ўнутрымоўных фактараў адносяцца стылістычная дэтэрмінаванасць, сфера і прадуктыўнасць функцыянавання афарызмаў.

Сукупнасць тых афарыстычных адзінак, якія з’яўляюцца найбольш ужывальнымі, а г. зн. і эпістэмалагічна актуальнымі для носьбітаў мовы на працягу доўгага часу яе функцыянавання і па сённяшні дзень, утвараюць асноўны афарыстычны фонд мовы. Катэгарыяльнай прыметай яго адзінак з’яўляецца іх панхранічнасць (аднолькава шырокая ўжывальнасць ва ўсё перыяды гістарычнага развіцця мовы). Асноўны афарыстычны фонд мовы мае палявую структуру (ядро і перыферыю), яго базу складае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

асноўны парэміялагічны фонд. У асноўным афарыстычным фондзе лакалізуецца поўны набор рэалій усяго фонду агульнанароднай мовы.

Афарызм – гэта не камунікатыўная, а намінатыўная адзінка, паколькі ўжываецца ў маўленні не для выражэння сітуацыі ці пэўнага мноства (класа) тых ці іншых сітуацый, а для намінацыі такіх рэалій, як заканамернасці рэчаіснасці (неабходныя і рэгулярныя ўласцівасці цэлых класаў аб'ектаў ці сувязі паміж імі ў межах сапраўднага ці выдуманага свету). Гэтым афарызм істотна адрозніваецца ад іншых устойлівых і свабодных выказванняў і ўтварае спецыфічны семантычны тып выказвання. У залежнасці ад розных характарыстык заканамернасцей рэчаіснасці вылучаюцца групы афарызмаў, у якіх адлюстраваны заканамернасці рэчаіснасці пэўных разнавіднасцей, або семантычныя тыпы афарыстычных адзінак.

Афарызм рэалізуецца ў маўленні ў сваёй парадыгматычнай форме – адной з тых варыянтных форм афарызма, якія ў сукупнасці маніфестуюць яго як моўную адзінку, аналагічна парадыгме форм слова ці фразеалагізма. Аказіянальныя афарызмы з'яўляюцца ізаморфнымі па структуры і спосабах функцыянавання узуальным і таксама могуць трансфармавацца ў кантэксце. Для афарыстычных наватвораў пэўная парадыгматычная мадыфікацыя можа быць адзінай формай іх існавання (рэалізацыі) у маўленні.

Афарыстычныя адзінкі з'яўляюцца ў выніку або іх утварэння, або трансляцыі з іншых моў (і тыя, і другія адзінкі праходзяць этапы інавацыі, неалагізацыі і ўзуалізацыі). Афарыстычная дэрывацыя размяжоўваецца на першасную (утварэнне новых афарызмаў адбываецца паводле структурна-семантычнай мадэлі абагульнена-ўніверсальнага выказвання шляхам свабоднага спалучэння лексічных і фразеалагічных адзінак і іх значэнняў на аснове існуючых у дадзенай мове сінтаксічных канструкцый) і другасную (утварэнне новых афарызмаў адбываецца шляхам відазмянення ці камбінацыі або асобных адзінак ніжэйшага ўзроўню, пераважна фразеалагічных, або адзінак гэтага ж узроўню – свабодных ці ўстойлівых выказванняў, у тым ліку афарыстычных). Вытворныя афарыстычныя адзінкі маюць два спосабы ўтварэння – перафразаванне зыходных адзінак або іх афарызацыю. Афарызацыя (у афарызмаўтваральным сэнсе) – гэта пераўтварэнне асобнай адзінкі (фразеалагізма, устойлівай або свабоднай фразы з рэферэнтнай семантыкай) у афарыстычную адзінку без яе трансфармацыі, шляхам змянення яе семантычнай структуры, сістэмных (парадыгматычных і сінтагматычных) сувязей.

Афарыстычным адзінкам уласцівы ўсе базавыя функцыі мовы і ўсе вытворныя ад іх (функцыі маўлення). Функцыі афарызма размяжоўваюцца на агульныя (уласцівыя афарызму як прадстаўніку мностваў адзінак, да якіх ён належыць – намінатыўных адзінак, аднафразавых тэкстаў і г. д.) і ўнікальныя (уласцівыя толькі афарызмам). Унікальнымі функцыямі афарыстычных адзінак з'яўляюцца ўніверсалізуючая і стылеўтваральная. Функцыянаванне афарызмаў у літаратурнай мове ўтварае такую яе стылістычную адметнасць, як афарыстычны стыль, які засноўваецца не на ўжыванні адзінкавых афарызмаў, а на зместавай універсалізацыі (афарызацыі) маўлення ўвогуле, калі апісанне падзеі або з'явы, разважанне на тую ці іншую тэму вядзецца з дапамогай пераважна або толькі афарыстычных адзінак. Індывідуалізацыя выкарыстання розных тыпаў афарыстычных адзінак у розных формах, сэнсах, функцыях і г. д. у межах рэалізацыі афарыстычнага стылю ўтварае яго індывідуальна-аўтарскую разнавіднасць – афарыстычны ідыястыль.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова